УДК 008:[316.722+39](476)

*Э. К. Дарашэвіч*

# Культурны тэзаўрус Беларусі

*Аналізуецца трансфармацыя паняцця культурнага тэзаўруса ў свеце. Вызначаецца роля фальклорнай культуры ў фарміраванні тэзаўруса культурных каштоўнасцей. Абгрунтоўваецца актуальнасць вывучэння карэннай культуры і неабходнасць яе інтэграцыі ў сучаснасць. Апісваецца вопыт кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па пашырэнні прасторы адукацыйных і культурна-антрапалагічных метадаў работы з нематэрыяльнай культурнай спадчынай.*



**Энгельс Канстанцінавіч Дарашэвіч**

Доктар філасофскіх навук, прафесар, прафесар кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

Слова тэзаўрус (грэч. *thesauros*), якое ўсё часцей ужываецца ў дачыненні да культуры і мастацтваў, літаральна перакладаецца з грэчаскай мовы на беларускую як «скарбніца» (рускае «сокровищница»). Сучасныя інфармацыйныя рэсурсы звычайна даюць паняццю два тлумачэнні: а) лінгвістычнае: «слоўнік (мовы цалкам ці мовы нейкай асобнай сферы дзейнасці) з поўнай і лагічна ўпарадкаванай сэнсавай інфармацыяй»; б) інфармацыйнае: «поўны сістэматызаваны набор даных пра нейкую галіну ведаў, які дазваляе чалавеку ці вылічальнай машыне ў ёй арыентавацца» [7].

Як бачым, справа тут не толькі ў слове ці паняцці, а ў тым, што ў ім месціцца, у працэсе паглыблення зместу. Некалі тэзаўрусам называлі толькі скарбніцу для каштоўных рэчаў: каштоўных металаў і камянёў, прадметаў культуры і мастацтва. У эпоху інфарматызацыі і глабалізацыі мы сустракаемся са з'явамі, якіх раней увогуле не было. І ў гэтых умовах паняцце «тэзаўрус» набывае яшчэ больш складаны змест, на пярэдні план выходзіць яго інфармацыйная і каштоўнасная сутнасць, асабліва, калі гаворка вядзецца пра культурны тэзаўрус, тэзаўрус культурных каштоўнасцей, іншымі словамі, пра еднасць «культурнай традыцыі і структур культурнага жыцця народаў як сістэму» [4].

Больш падрабязна пра асаблівасці тэзаўруса ў дачыненні да культуры аўтар распавядае ў шэрагу выданняў. У артыкулах ёсць спасылкі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на расійскага вучонага У. А. Лукава, які распрацаваў падыход да тэзаўрусных даследаванняў у літаратуры і практыцы [4].

Бясспрэчна, што без карэннай (фальклорнай) культуры грунтоўнага тэзаўруса культурных каштоўнасцей не атрымаецца. Як адзначаюць даследчыкі традыцыйнай культуры Беларусі, няспынны кругаварот прыроды наканаваў кожнаму чалавеку прайсці сваё – такое ж, як у іншых людзей, і разам з тым адметнае, непаўторнае – жыццёвае кола. Таму ў кожным чалавеку захаваны «зрэз» культуры яго народа – у часаўспрыманні (календары), стаўленні да родных і сваякоў (сямейна-абрадавым традыцыйным комплексе). Людзі звычайна адчуваюць і сувязь з мастацкім афармленнем бегу жыцця – традыцыйным абрадавым мастацтвам свайго народа. Адзін з заснавальнікаў практычнай фалькларыстыкі Рыгор Шырма зрабіў выснову, што «беларускі народ з'яўляецца адным з найбольш заглыбленых у сваю песенную творчасць народаў у Еўропе» [2, с. 124].

Каб высветліць, што сёння ўваходзіць у сярэднестатыстычны тэзаўрус культурных каштоўнасцей беларусаў, мы правялі папярэднюю даследчую працу. Яна выявіла наступныя заканамернасці. Першае, што называюць сярод сваіх культурных каштоўнасцей, – помнікі архітэктуры, выяўленчага мастацтва, гістарычныя асобы асветнікаў і пісьменнікаў. Гэта ў асноўным з'явы гарадской культуры Беларусі. У простай схеме-апытанні, якую мы выкарыстоўвалі для сацыялагічнага пілатажу (папярэдняе апытанне перад сістэматычным, напрыклад, па рэспубліканскай выбарцы), месца фальклору было амаль апошнім. У большасці анкет рэспандэнтаў былі сціплыя звесткі па фальклоры. Апошняе сведчыць аб недастатковай увазе да фальклору ў нашым жыцці і ў выхаваўчай рабоце. Але пасля разбору пілатажных анкет (з мінімальным напамінам пра карэнную культуру) апытаныя ў другі раз рэспандэнты сур'ёзна аднесліся менавіта да гэтага раздзела тэзаўруса і наступнае апытанне мела станоўчыя для фальклору вынікі.

Неабходнасць вывучэння карэнных, стыхійна сфарміраваўшыхся форм культуры, якія існавалі тысячагоддзі і паспяхова выканалі галоўную функцыю культуры (функцыю задавальнення фізічных і духоўных запатрабаванняў этнасу як біясацыяльнай сістэмы), неаднаразова падкрэслівалася навукоўцамі. У гэтым кантэксце даследаванні фалькларыстаў і этнічных антраполагаў падобныя да вывучэння ўніверсальных форм чалавечай гісторыі [8, с. 5]. І сапраўды, фалькларысты даследуюць асобныя карэнныя формы арганізацыі мыслення і паводзін – асобныя традыцыйныя культуры.

У XXI ст. відавочна, што традыцыйныя культуры сябе гістарычна спраўдзілі – праіснавалі працяглы час, дастатковы для таго, каб стаць спадчынай, якая перадаецца паміж пакаленнямі з нагоды каштоўнасці для супольнасці. Многія элементы вясковых еўрапейскіх культур увайшлі ў светапогляд і паводзіны гараджан і невынішчальны з іх культуры, бо ахоўваюць псіхічнае і фізічнае здароўе чалавека, бароняць яго



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ад стрэсаў, адзіноты, канфліктаў з сабой і асяроддзем. Французскі геній XX ст. Рэнэ Генон папярэджваў, што традыцыяй можна лічыць «не ўсялякае перайманне, а перайманне таго, што вартае пераймання» [4, с. 86]. Таму кожная вывучаная традыцыя (і яе мадыфікацыя, развіццё, сінтэз з сучаснасцю), бясспрэчна, прапануе нешта карыснае для гістарычнага вопыту і стратэгіі выжывання чалавецтва ўвогуле.

Асэнсаванне спадчыны традыцыйнай культуры, пошук форм яе інтэграцыі ў сучаснасць – актуальная тэарэтычная і практычная праблема для еўрапейцаў XXI ст., якія з увагай глядзяць на Усход, дзе дэманструецца жыццяздольны сінтэз традыцый і мадэрнізму (Японія, Паўднёвая Карэя, Кітай, Індыя, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты). Гэта вядзе ўсходнія нацыі да эканамічнага і культурнага дамінавання ў свеце. Эдвін Тофлер у творах «Трэцяя хваля» і «Футурашок» адзначае: выйсце з культурнага крызісу Захаду – вяртанне да глыбіннай спадчыны яго культуры. Даследчык падкрэслівае, што такія інтэнцыі актуальныя нават у ЗША (краіне поліэтнічнай, чыя культура сфарміравана пераважна на аснове касмапалітызму і мадэрнізацыі), таму што толькі традыцыі ўпарадкоўваюць інавацыі, і толькі традыцыі здольныя паменшыць «шок ад інавацый культуры».

Сёння нематэрыяльная культурная спадчына – помнікі фальклору – запатрабаваны грамадствам на новым, глабалізацыйным, вітку развіцця. Фальклор вабіць увагу і вузкага кола даследчыкаў, і прадстаўнікоў буйных сацыяльных рухаў (традыцыяналістаў, футуролагаў, аматараў поп-арту і авангарда), якія часам выступаюць у якасці вытворцаў ці спажыўцоў твораў мастацтва, заснаванага на традыцыйных формах. Даследчыкі амаль аднагалосна сцвярджаюць, што фальклор – праграмная аснова ўсёй гуманістычна арыентаванай сусветнай мастацкай культуры, крыніца асобных нацыянальных мастацкіх традыцый, увасабленне самасвядомасці народаў.

Увогуле, калі весці гаворку пра актуальнасць даследавання фальклору, варта памятаць пра розныя падыходы да яго. Таццяна Вінаградава, фальклярыст, педагог, кіраўнік цэнтра этнакультурнага выхавання «Кіцежград» з Санкт-Пецярбургу, сцвярджала, што так званыя «агульначалавечыя каштоўнасці – не ўніверсальныя, яны створаны ў культурах асобных народаў». А іншыя этнографы мяркуюць, што «…кожны фрагмент сусветнай культуры належыць усяму чалавецтву цалкам, таму шкодных ведаў няма, як няма і бессэнсоўнага мастацтва» [1, с. 26]. Практычныя намаганні па дасягненні пэўнай мэты ад пачатку (калі ставяць дасягальныя мэты) павінны быць добра змадэляванымі, падрыхтаванымі тэарэтычнымі выкладкамі, таму гісторыкі культуры і эстэтыкі лічаць, што «сёння, як ніколі раней, важнае значэнне набывае агульная тэорыя фальклору, якая магла б стаць навуковай асновай для практычнай фальклярыстыкі, запраграмаванай на адраджэнне народнай творчасці» [5, с. 61].

Наша праца па апытаннях (з мэтай удакладнення культурнага тэзаўруса сучаснага грамадства) у асноўным тычылася студэнтаў Беларускага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Але некаторыя апытанні праводзілі і з рознымі фокус-групамі (розны ўзрост, пол, спецыяльнасць, месца ў народнай гаспадарцы і г. д.). Канешне, гэта былі збольшага пілатажныя апытанні, але яны сведчылі аб тым, што такая работа дае кірунак для больш значнага замеру каштоўнасных арыентацый у іх сувязі з рознымі культурнымі тэзаўрусамі. Ускосна гэтыя даныя пацвярджаюцца некаторымі расійскімі даследаваннямі.

Адна з галоўных нашых гіпотэз – фальклор у беларускім светапоглядзе мае вялікі культурны і маральны патэнцыял, і гэта павінна мець пацвярджэнне ў даследаваннях. Аднак у інфармацыйнай прасторы, якая асацыіруецца з культурай (СМІ, Інтэрнэт), сёння ён амаль не прадстаўлены. Таму каб фальклор уключаўся рэспандэнтамі ў культурны тэзаўрус, пра яго трэба спецыяльна нагадваць. Адсюль плыня этнамастацкай адукацыі і этнакультурнага выхавання набывае актуальнасць у сённяшняй культурнай сітуацыі.

Кафедра этналогіі і фальклору БДУКМ праявіла ініцыятыву па пашырэнні прасторы адукацыйных і культурна-антрапалагічных метадаў работы з фальклорам, якія ўключаюць і культурна-сацыялагічныя метады. Пад кіраўніцтвам прафесарска-выкладчыцкага саставу студэнты не толькі непасрэдна знаёмяцца з помнікамі фальклорнай спадчыны на практычных і лекцыйных занятках, але і пішуць аналітычныя работы культурна-антрапалагічнага напрамку, накіраваныя на вывучэнне і захаванне рэгіянальнага фальклору.

Такім чынам, кафедра выкарыстоўвае інавацыі ў вывучэнні і папулярызацыі фальклору. Гэты вектар патрабуе не толькі практычных захадаў (тут у кафедры шмат напрацовак – дзейнасць вядомых у Беларусі і за межамі фальклорных калектываў «Талака», «Кроса», «Этнасуполка», «Раме», «Вяснянка», «Страла»), але і сур'ёзных тэарэтычных абагульненняў, многія з якіх у Беларусі яшчэ толькі нараджаюцца і, магчыма, набудуць выгляд айчыннай навуковай школы культурнай антрапалогіі, заснаванай на вывучэнні і захаванні карэнных элементаў культурнага тэзаўруса нашага грамадства.

Даследчык, узброены дасягненнямі тэорыі фальклору, суквецце культур сучаснасці бачыць як з'явы, ахутаныя тонкім павуціннем наступстваў традыцыйнага светаўспрымання, паводзін і артэфактаў. А ў гэтыя дасягненні ўваходзяць канцэпцыі энцыклапедычна адукаваных Клода Леві-Строса, Мірчы Эліядэ, Яўгена Гіпіуса, Барыса Пуцілава і інш. тытанаў народазнаўства XX ст. Таму традыцыйнай культуры наканавана існаваць (у тым ці іншым выглядзе) і ў XXI ст. Якой будзе гэта «абмотка» традыцыі, і ці стане яна каркасам будучыні – сёння можна толькі прагназаваць. Але большасць паслядоўных аналітыкаў усё ж ускладае на постфальклор і традыцыяналістычныя сацыяльныя рухі спадзяванні.

Постфальклорныя з'явы з цягам часу (згодна з уласным генезісам і зместам) маюць тэндэнцыю вяртання да аўтэнтычных форм – форм

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

максімальна набліжаных да традыцыі. Бясспрэчна, што ў традыцыяналізме заўсёды моцная альтэрнатыва бессістэмнай мадэрнізацыі і авантурнаму футурызму. Так гучаць меркаванні людзей, якія ўзважваюць свае словы і прадстаўляюць перакананні буйных супольнасцей і нават сусветных канфесій. Папа рымскі Бенедыкт XVI казаў: «Мэтай усіх сучасных рухаў за свабоду …з’яўляецца “быць як Бог”, гэта значыць ні ад каго і ні ад чаго не быць у залежнасці. Свабода ж чалавека – гэта раздзеленая свабода, свабода ў сумесным быціі свабод, узаемна абмяжоўваючых і нясучых адно аднаго» [6, с. 31]. Без сумнення, апошняе надзвычай блізка стаіць да светапогляду носьбітаў традыцыі, якія (адпаведна з даследаваннем кагнітыўнай культуралогіі) без паняцця «Мы» не мяркуюць паняцце «Я», але пры гэтым застаюцца вольнымі і задаволенымі жыццём. Як правіла, яны дакладна ўсведамляюць, што ў сумеснай прыхільнасці асвечанаму часам запавету («старынушка» – завуць яго ўдзельніцы палескай «Стралы») – шлях да супольнага жыцця ва ўпарадкаваным, гуманістычным і людскім свеце.

1. *Бромлей, Ю. В.* Культура народов мира глазами этнографов / Ю. В. Бромлей, Р. Г. Подольный // Глазами этнографов / редкол.: Ю. В. Бромлей (отв. ред.) [и др.]. – М. : Наука, 1982. – С. 3–27.

2. *Варфоломеева, Т.* Направления в области практической фольклористики / Т. Варфоломеева // Белорусская этномузыкология : очерки истории (XIX–XX вв.) / З. Можейко [и др.] ; под. ред. З. Можейко. – Минск : Тэхналогія, 1997. – С. 123–161.

3. *Генон, Р.* Очерки о традиции и метафизике / Р. Генон ; пер. с фр. В. Ю. Быстрова. – СПб. : Азбука, 2000. – 320 с.

4. *Дорошевич, Э. К.* Белорусский тезаурус: социокультурная реконструкция : учеб. программа для специальности 1-23 01 05 Социология / Э. К. Дорошевич. – Гродно : ГрГУ, 2010. – 7 с.

5. *Конан, У.* Эстэтыка і паэтыка фальклору / У. Конан // Выбранае ; уклад. М. А. Козенка. – Мінск : Смэлтак, 2009. – С. 470–531.

6. *Ратцингер, Й. (Бенедикт XVI).* Вера – Истина – Толерантность. Христианство и мировые религии / Й. Ратцингер. – М. : Библейско-богословский ин-т св. апостола Андрея, 2007. – 376 с.

7. Тезаурус // Иностранные языки для всех. Словари онлайн [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.classes.ru/all-russian/russian-dictionary-synonyms-term-85307.htm#foreign. – Дата доступа: 04.12.2014.

8. *Kroeberg, A. L.* Configurations of culture growth / A. L. Kroeberg. – Berkeley: Univ. of California Press, 1944. – 882 p.

*E. Doroshevich*

**Cultural thesaurus of Belarus**

*The transformation of the notion of cultural thesaurus in the world is analyzed. The role of folk culture in the formation of cultural values’ thesaurus is defined. The relevance of the native culture study and the necessity of its integration into modernity are substantiated. The experience of the Department of Ethnology and Folklore of the Belarusian State University of Culture and Arts by expanding the space for educational and culturally-anthropological methods of work with intangible cultural heritage is described.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 07.09.2015.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ